*Архітэктура і сучаснасць*

Тамара ГАБРУСЬ

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА - НАША АГУЛЬНАЯ СПРАВА

Гэта агульная справа не толькі таму, што грамадскасць падтрымлівала і падтрымлівае важны дзяржаўны праект эканамічна, але і таму, што ў нашай краіне няма больш дэмакратычнай і інтэлектуальна насычанай установы, чым Нацыянальная бібліятэка. Сёння будаўнічыя работы амаль што завершаны, бібліятэчныя фонды перасяляюцца ў новы будынак. Адначасова вырашаюцца пытанні стварэння комплекснага архітэктурна-мастацкага вобраза збудавання і добраўпарадкавання прылеглай тэрыторыі. Бібліятэкі, паводле вызначэння, з'яўляюцца сховішчамі духоўных скарбаў сусветнай цывілізацыі і шматлікіх народаў, што яе складаюць. Гэтая высокая місія, безумоўна, павінна быць выяўлена ў вобразе бібліятэкі, што мае ранг Нацыянальнай.

Кампазіцыйным ядром архітэктурнага выраўэння будынка новай Нацыянальнай бібліятэкі з'яўляецца цэнтрычная шматгранная форма кнігасховішча. Увесь комплекс бібліятэчна-інфармацыйных службаў размешчаны ў ступеньчатым трохпавярховым подыуме, які таксама амаль цэнтрычны і нагадвае шматпялёсткавую кветку. У цэнтры, пад кнігасховішчам, знаходзіцца трохсветны, круглы ў плане інфармацыйны атрыум — так па-антычнаму называюць гэтае памяшканне аўтары праекта. Ад яго радыяльна разыходзяцца чытальныя залы, падзеленыя зялёнымі дворыкамі, і шэраг іншых дапаможных памяшканняў самастойнага прызначэння: экспазіцыйна-выставачная зона, кавярня, кулуары і інш. Сістэма сувязі інфармацыйнага цэнт-



Фота аўтара. Жнівень 2005 г.



ра з кнігасховішчам будзе ажыццяўляцца па вертыкалі, а з чытальнымі заламі - па гарызанталі. Такая аптымальная сістэма камунікацый дазволіць рэалізаваць дастаўку кніг чытачам у максімальна сціслыя тэрміны. Як бачым, гэты функцыянальны складнік агульнай архітэктурнай задумы лагічны і лаканічны, але жорсткая замкнёная "метафізічная" форма кнігасховішча абмяжоўвае магчымасці далейшага развіцця ўсяго комплексу ў адзіным мастацкім кірунку.

Відавочна, што унікальная прасторавая форма "ядра" будынка бібліятэкі абумоўлена не толькі і не столькі сістэмай камунікацый, колькі (і ў большай ступені!) задачамі мастацкай вобразнасці архітэктуры. Аўтары праекта, лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі РБ архітэктары Віктар Крамарэнка і Міхаіл Вінаградаў, ад пачатку акцэнтавалі ўвагу менавіта на незвычайнай форме кнігасховішча, што павінна нагадваць дыямент, найкаштоўнейшы ў скарбніцы нашага народа. Гэтым яны акрэслілі ў агульных рысах мастацка-вобразную семантыку, якую павінна несці грамадскае збудаванне такога ўзроўню значнасці. Акрамя таго, ужо некалькі гадоў таму было прынята рашэнне пра ўстаноўку каля бібліятэкі манументальнага помніка Францішку Скарыну як заснавальніку ўсходнеславянскага кнігадрукавання* (скульптар Аляксандр Дранец). Гэтая таленавітая работа атрымала перамогу на двух творчых конкурсах яшчэ на пачатку 1990-х гг. і з тае пары чакала свайго месца і часу.

Дзіўна, але толькі на апошнім этапе, прыблізна год таму, да вызначэння і стварэння комплекснага архітэктурна-мастацкага вырашэння бібліятэкі быў падключаны Рэспубліканскі экспертны савет па манументальным мастацтве Міністэрства культуры РБ, у дзейнасці якога і мне давялося прыняць актыўны ўдзел. Саветам

* Выява мадэлі помніка змешчана на вокладцы часопіса "Роднае слова" (2005, № 8). - *Заўвагарэд.*

было вырашана, што стрыжнявой для агульнай архітэктурна-мастацкай задумы павінна стаць тэма беларускага кнігадрукавання, а не славянскага пісьменства, як меркавалася раней. Паводле думкі аўтараў, партал галоўнага ўвахода ў бібліятэку мусіў быць увасоблены ў выглядзе разгорнутай кнігі з важкім рустам альбо гарэльефамі на старонках-крылах. Але пасля шматлікіх дыскусій, абмеркаванняў, творчых прапаноў скульптараў крылы партала былі зроблены больш лёгкімі, абліцаванымі светлым каменем з нізкім рэльефам пластыкі. На левым ад увахода крыле на фоне выявы геліяцэнтрычнай сістэмы Каперніка на розных мовах прадстаўлены крылаты выраз з Кнігі Кніг — Бібліі: "Каб быў дасканалым Божы чалавек"; на правым крыле, на фоне вядомых скарынаўскіх сімвалаў, - выказванні беларускіх асветнікаў пра карысць Ведаў і Роднага Слова, таксама на мовах тых народаў, што сталі неад'емнымі ад Беларусі. Сярод іх і славутае выказванне Францішка Багушэвіча: "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!", за якое мне асабіста давялося пазмагацца. Фонавымі для левага крыла сталі лацінскія літары, так званы "антык", а для правага — кірылічныя літары ў інтэрпрэтацыі Ф. Скарыны. Жоўты колер надпісаў імітуе золата (на сапраўднае, на жаль, не пацягнулі), што падкрэслівае каштоўнасць выказанай думкі. Па баках партала, на асобных калонах злева і справа ад яго, будуць усталяваны бронзавыя скарынаўскія літары "А" і "Я". Уваходную парадную лесвіцу прарэзвае фантан у выглядзе каскада з дэкаратыўнай краткай, якая паўтарае скарынаўскі арнамент. На думку аўтараў, гэтая малая архітэктурная форма сімвалізуе крыніцу ведаў, што нібыта выцякае з бібліятэкі.

Экспертны савет аднагалосна прыняў рашэнне пра ўстаноўку помніка Ф. Скарыну перад уваходам у бібліятэку, па восі сіметрыі будынка, што павінна было падкрэсліць змест і сутнасць агульнай задумы. Урачыстая манументальная постаць Ф. Скарыны з узнятымі ўгору рукамі нібыта ўздымала над сабой ядро кнігасховішча, як "сонца ведаў". Але рашэннем Мінгарвыканкама помнік насамрэч устаноўлены на адлегласці злева ад будынка, павернуты да праспекта не франтальна, а ў тры чвэрці, што, магчыма, звязана з перайменаваннем галоўнай магістралі сталіцы. Пастаўлены на фоне адкрытай прасторы, не падтрыманы архітэктурнымі аб'ёмамі, помнік Ф. Скарыну страчвае свой маштаб і не выконвае запланаваную гістарычную місію галоўнага манумента Рэспублікі XXI стагоддзя, як магло быць. На жаль, пры рэалізацыі ідэі не прыслухаліся да меркаванняў прафесіяналаў, а кіраваліся валюнтарысцкімі рашэннямі.

Яшчэ адна хіба паўстала ўвачавідкі толькі пры заканчэнні будаўніцтва. Для зашклення граняў "дыямента"-кнігасховішча было выкарыстана таннае шкло бутэлечнага колеру, а не танаванае люстэркавае шкло, што дазваляе сабе цяпер кожны банкаўскі офіс. У выніку на паўночным галоўным фасадзе, у контражуры, няма аніякага "ззяння", як прадстаўлялася ў праекце. "Дыямент" нагадвае, хутчэй, гранёны шкляны флакон. Здаецца, тут дзейнічае прымаўка, што скнара плаціць двойчы. І добра было б, каб тое спраўдзілася, іначай будзе цалкам страчаны адзін з галоўных кампанентаў мастацкага вобраза збудавання. Магчыма, і граням "дыямента" патрэбна было надаць пэўны невялікі нахіл, каб у іх адлюстроўвалася неба. Строгая цэнтрычнасць кампазіцыі ўсё роўна парушана прыбудовай да яе асобнай шахты вертыкальных камунікацый (лесвічна-ліфтавога блока), што абумоўлена проціпажарнай бяспекай. Яна вядзе да самай відавой пляцоўкі на версе будынка, адкуль можна будзе аглядаць панараму горада.

Сёння група скульптараў і мастакоў-манументалістаў на чале з Аляксандрам Дранцом і Уладзімірам Крываблоцкім актыўна працуе над мастацкім афармленнем інтэр'ераў будынка, асабліва атрыума. Тут адбываецца найбольш арганічнае ўзаемадзеянне паміж архітэктурай і манументальным мастацтвам. У прасценках паміж праёмамі будуць размешчаны алегарычныя рэльефныя выявы шасці абласцей рэспублікі і яе сталіцы, выкананыя ў леўкасе, сціпла танаваныя блакітам і золатам, светлыя па каларыце і змесце. Моцны мастацка-семантычны акцэнт надаецца кольцаваму размеркавальнаму калідору вакол атрыума. У ім на двух паверхах будуць экспанавацца творы выдатных беларускіх мастакоў у галіне жывапісу, графікі, габелена, скульптуры на тэмы гісторыі, асветніцтва, этнічнай самабытнасці Беларусі. Такіх прац, дзякуй Богу, нямала, але для адбору найлепшых пастаўлены вельмі высокія крытэры. Творы, што сталі ўжо класікай выяўленчага мастацтва, будуць спалучацца з новымі, зробленымі адмыслова для Нацыянальнай бібліятэкі, і аб'ядноўвацца агульным пачуццём высокага патрыятызму. Шмат у чым стваральнікі ідэі натхняліся прыкладам новай Александрыйскай бібліятэкі, дзе павага да мінулага ўдала знітавана з сучаснай эстэтыкай.

Ва ўспрыманні мастацкага вобраза Нацыянальнай бібліятэкі важную ролю адыгрывае добраўпарадкаванне прылеглай тэрыторыі. Вялікая забрукаваная пляцоўка перад уваходам з кветнікамі працягваецца шырокімі плаўнымі сцежкамі адпаведна рэльефу і транспартным сувязям. Удалым кампанентам з'яўляецца ўключэнне ў ландшафтную кампазіцыю воднага люстра. З цягам часу паркавую зону дапоўняць творы малых архітэктурных формаў, тэматычныя і дэкаратыўныя скульптурныя кампазіцыі, дзе змогуць выказаць сябе многія маладыя мастакі. Магутны кубічны пастамент з чырвонага граніту для скульптуры Францішка Скарыны будзе ўпрыгожаны бронзавым надпісам з франтальнага боку, а з трох астатніх бакоў — бронзавымі рэльефамі з панарамамі гарадоў таго часу: Полацка, дзе нарадзіўся вялікі асветнік, Падуі, дзе ён праславіў сваю Айчыну і атрымаў ступень доктара філасофіі і медыцыны, і Прагі, дзе ім была надрукавана першая ўсходнеславянская кніга і дзе наканаваннем лёсу ён пайшоў з жыцця ў несмяротнасць. Агульнымі намаганнямі творцаў, будаўнікоў, чытачоў і крытыкаў мы атрымаем, я спадзяюся, станоўчы вынік справы на карысць і гонар нашай краіны.